# Еўрапейская Хартыя мясцовай маладзёжнай працы

EUROPE GOES LOCAL
Supporting Youth Work at the Municipal Level

**Дэмакратычнаму грамадству патрэбны галасы і актыўны ўдзел моладзі.** Для таго, каб адпавядаць гэтым спадзяванням, маладым людзям неабходна месца, дзе яны могуць рэалізаваць свае жаданні і патрэбы. Прастора, дзе яны могуць даследаваць, фармуляваць і развіваць свае інтарэсы, таленты і ідэі на будучыню разам са сваімі аднагодкамі. **Прастора, дзе яны атрымаюць стымул, натхненне і падтрымку для далейшага развіцця ведаў, навыкаў, адносін і каштоўнасцей, неабходных ім для поўнага раскрыцця іх патэнцыялу як людзей і грамадзян.** Маладзёжная праца можа прапанаваць менавіта гэтую прастору, і моладзь[1] з'яўляецца і павінна быць і заставацца галоўнай дзеючай асобай. **Праца з моладдзю – гэта працэс навучання не толькі для моладзі, але і для грамадства ўвогуле.** Праца з моладдзю – гэта бяспройгрышная інвестыцыя, і яна адыгрывае жыццёва важную ролю ў грамадстве, якое імкнецца да інтэграцыі і сацыяльнай згуртаванасці.



Галоўныя мэты працы з моладдзю былі выкладзены ў шэрагу важных палітычных дакументаў як Еўрапейскага Саюза, так і Савета Еўропы[2] . Аднак цяперашняя Хартыя не з'яўляецца палітычным дакументам. Яна пераўтварае гэтыя дакументы ў канкрэтныя рэкамендацыі ў якасці арыенціра для таго, што неабходна для падтрымання і далейшага развіцця мясцовай маладзёжнай працы высокай якасці. **Ідэя Хартыі ўпершыню ўзнікла на 2-м кангрэсе маладзёжнай працы ў Брусэлі ў 2015 годзе.** У заяве кангрэса гаворыцца: "Удзельнікі кангрэса заклікаюць да большага ўсведамлення адказнасці на мясцовым узроўні і дамоўленасці паміж мясцовымі і рэгіянальнымі ўладамі аб Еўрапейскай Хартыі па працы з моладдзю на мясцовым узроўні". За гэтым хавалася матывацыя стварэння агульнай асновы для працы з моладдзю. На падставе гэтай дэкларацыі 22 нацыянальныя агенцтвы па праграме ЕС  Эразмус+ у маладзёжнай сферы пачалі праект стратэгічнага супрацоўніцтва "Еўропа становіцца мясцовай"[3], партнерамі якога з'яуляюцца: сеткі InterCity Youth і POYWE, Еўрапейскі маладзёжны форум і  Партнерства ў маладзёжных накірунках паміж ЕС і Саветам Еўропы.  Хартыя – адно з галоўных дасягненняў гэтага праекта.

Яна была распрацавана ў рамках агульнаеўрапейскага працэсу консультацый, у якім удзельнічаў шырокі спектр зацікаўленых бакоў на ўсіх узроўнях, такіх, як урады, мясцовыя органы ўлады, НДА, маладзежныя арганізацыі і саветы, парасонавыя арганізацыі і многія іншыя. Такім чынам, стварэнне Хартыі было ініцыявана і напісана еўрапейскай маладзёжнай рабочай супольнасцю, у адпаведнасці з ідэямі якой Хартыя павінна закрануць усіх ўдзельнікаў - ад тых, хто прымае палітычныя рашэнні, да спецыялістаў, да моладзі, якая займаецца працай моладзі і хоча спрыяць іх поспеху.



**Мэта Хартыі – унесці свой уклад у будучае развіццё мясцовай працы моладзі.** Яна сочыць за гэтым, вызначаючы рэкамендацыі і розныя аспекты, якіх трэба прытрымлівацца. Такім чынам, Хартыя ўтварае агульную еўрапейскую платформу для неабходнага дыялогу па працы моладзі. Гэта добраахвотны метадалагічны інструмент, своеасаблівы кантрольны спіс, на аснове якога розныя ўдзельнікі могуць складаць і абмяркоўваць меры па далейшым развіцці маладзёжнай працы, пераканаўшыся, што ні адзін з аспектаў і перспектыў не будзе занядбаны і што праца ажыццяўляецца найлепшым і найбольш эфектыўным чынам. Хартыю трэба разглядаць як адзінае цэлае – розныя пункты пералічваюцца ў парадку іх логікі, а не ў парадку прыярытэту.



**Тым не менш, маладзёжная праца характарызуецца асаблівай разнастайнасцю не толькі з пункту гледжання практычных аспектаў, але і з пункту гледжання арганізацыі, кантролю і фінансавання.** Нават калі маладзежная праца пераважна пачынаецца і праводзіцца на мясцовым узроўні, розныя ўдзельнікі на розных узроўнях нясуць адказнасць за пункты, пералічаныя ў Хартыі. Ніхто не можа самастойна задаволіць усе патрабаванні, ніхто не можа ўхіліцца ад адказнасці. З мэтай заахвочвання дыскусій наконт прымянення Хартыі да розных мясцовых сітуацый яна дапаўняецца анлайн-наборам інструментаў, які змяшчае розныя пункты гледжання, тлумачэнні, даведачныя дакументы і прыклады добрай практыкі для розных раздзелаў і пунктаў.

1 Аднак падлеткі не з'яўляюцца аднароднай групай. У іх рознае паходжанне, інтарэсы і ідэі, яны могуць быць арганізаванымі альбо неарганізаванымі, і ў іх розныя патрэбы з-за гэтых і іншых адрозненняў.

2 Да іх адносяцца:
- Высновы Савета аб укладзе якаснай маладзёжнай працы ў развіццё, дабрабыт і сацыяльную інтэграцыю моладзі (2013 / C 168/03)
- Парадак дня 2020, Рэзалюцыя CM / Res (2008) 23 Камітэта міністраў па маладзёжнай палітыцы Савета Еўропы
- Рэкамендацыя (CM / Rec (2017) 4) Савета Еўропы дзяржавам-членам па працы з моладдзю
- Пашырэнне магчымасцей моладзі: новая стратэгія ЕС для маладых людзей (COM / 2018/269 final)

3 Праект фінансуецца ў рамках транснацыянальнага супрацоўніцтва праграмы Эразмус+

## МАЛАДЗЁЖНАЯ ПРАЦА ЗАСНАВАНА НА КАШТОЎНАСЦЯХ, ЯЕ АСНОЎНЫЯ ПРЫНЦЫПЫ:

- на аснове добраахвотнага ўдзелу моладзі, маладых людзей, якія актыўна займаюцца маладзёжнай працай па ўласнай волі і матывацыі;
- заснаваныя на патрэбах, інтарэсах, ідэях і вопыце маладых людзей, як яны іх ўспрымаюць, рэагуюць на іх і тым самым прыносяць дадатковую карысць і / або жыццярадаснасць;
- распрацавана, арганізавана, спланавана, падрыхтавана, праведзена і ацэнена разам з моладдзю або ёю;
- ўнесці свой уклад у асабістае і сацыяльнае развіццё маладых людзей з дапамогай нефармальнага і неафіцыйнага навучання;
- імкнуцца да ўзмацнення самавызначэння, самастойнасці і доступу моладзі да правоў;
- мець цэласны погляд на маладых людзей і ўспрымаць іх як здольных людзей, якія самавызначыліся ў сваім уласным жыцці і ў грамадстве ўвогуле;
- спрыяць крытычнаму мысленню і творчасці і адстойваць правы чалавека, дэмакратычныя каштоўнасці і актыўную грамадзянскую пазіцыю;
- быць інклюзіўным і прапаноўваць роўныя магчымасці ўсім маладым людзям.



## МЕТОДЫКА, ЯКАЯ РЭГУЛЮЕ ПРАЦУ З МОЛАДДЗЮ:

- распрацоўваюцца:
  - у адпаведнасці з асноўнымі прынцыпамі, названымі вышэй;
  - ва ўмовах супрацоўніцтва паміж усімі зацікаўленымі бакамі, уключаючы моладзь, якая выконвае пэўныя функцыі і ўдзельнічае ва ўсіх этапах працы;
  - на аснове актуальнай інфармацыі аб патрэбах, правах і інтарэсах моладзі. Таксама для дасягнення мэты могуць выкарыстоўвацца новыя метады і формы ўзаемадзеяння з моладдзю, выпрацаваныя ў выніку апошніх даследаванняў;

- грунтуецца на выразных якасных і колькасных паказчыках адносна таго, якія мэты варта паставіць у дачыненні да ўдзелу, навучання, а таксама ўплыву на моладзь;

- размяркоўвае рэсурсы, неабходныя для дасягнення мэтаў;

- змяшчае выразныя і адобраныя ўладамі мэты і задачы, якія паважаюць аўтаномію мясцовых няўрадавых арганізацый;

- выразна вызначана і цесна звязана з больш шырокамаштабнымі стратэгіямі працы з моладдзю на ўсіх тэрытарыяльных узроўнях.



## ДЗЕЙНАСЦЬ АРГАНІЗАЦЫЙ ПА ПРАЦЫ З МОЛАДДЗЮ БУДУЕЦЦА НА:

- стварэнні дыялогу паміж усімі зацікаўленымі бакамі;
- пабудове планаў і стратэгій па дасягненню пастаўленых мэтаў і задач;
- вызначэнні папярэдніх умоў і працоўнага працэсу для эфектыўнага ўзаемадзеяння з моладдзю;
- бесперапынным абмене інфармацыі аб планах і актыўнасцях ў працы з моладдзю з іншымі ўдзельнікамі на мясцовым, нацыянальным і еўрапейскім узроўнях; а таксама пабудове актыўнага супрацоўніцтва як унутры, так і за межамі сектара працы з моладдзю;
- забеспячэнні маладых людзей рэкамендацыямі, а таксама доступам да актуальнай інфармацыі аб іх правах і магчымасцях датычна ўдзелу ў рознага роду мясцовай, нацыянальнай і міжнароднай дзейнасці;
- стымуляванні і падтрымцы маладых людзей у:
  - пераадоленні перашкод на шляху інтэгравання ў грамадства, у абмене вопытам, ведамі і ідэямі, у арганізацыі дзейнасці, а таксама прыняцці рашучых дзеянняў;
  - прыўнясенні карыснага вопыту ў грамадзянскую супольнасць, уключаючы ўдзел у прыняцці палітычных рашэнняў;
  - інтэграцыі ў сусветную супольнасць, а таксама актыўны ўдзел у рэгіянальнай, нацыянальнай і міжнароднай мабільнасці.
- выразным вызначэнні актуальных мэтаў, распрацаваных сумесна з моладдзю і якія тычацца асобаснага і сацыяльнага развіцця маладых людзей;
- выяўленні і дакументаванні афіцыйных і неафіцыйных вынікаў працы з моладдзю, т. е. ведаў, навыкаў, адносін і каштоўнасцяў, якія пацвярджаюць выніковасць працэсу;
- забеспячэнні работнікаў з моладдзю інфармацыяй, ведамі і навыкамі, актуальнымі для задавальнення патрэбаў моладзі на мясцовым узроўні, а таксама для стымулявання і падтрымкі бесперапыннага развіцця кампетэнцый.



# ПРАЦАЎНІКІ З МОЛАДДЗЮ ПАВІННЫ::

- дзейнічаць у рамках этычных пастулатаў, а таксама дакладна прытрымлівацца асноўных прынцыпаў, названых вышэй; Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека, дэкларацыі правоў дзіцяці, а таксама Еўрапейскай канвенцыі па правах чалавека;
- кіравацца ўласным жаданнем падтрымаць маладых людзей у іх сацыяльным і асобасным развіцці;
- ствараць спрыяльную і даверную атмасферу, пабудаваную на прынцыпах інклюзіі, а таксама якая грунтуецца на сацыяльным дачыненні, крэатыўнасці і бяспекі, у якой сур'ёзная і сплянаваная праца можа працякаць у гульнявой манеры;
- бачыць неабходнасць і шукаць шляхі вырашэння ў:
  - уключэнні моладзі ва ўсе этапы працоўнага працэсу;
  - падтрымцы маладых людзей у самаарганізацыі;
- мець кампетэнцыі такія, як веды, навыкі і каштоўнасці, неабходныя для арганізацыі працэсу працы з моладдзю ў адпаведнасці з прынцыпамі, апісанымі ў дадзенай Хартыі;
- арганізоўваць працу з моладдзю ва ўмовах узаемнага навучання, а таксама бачыць неабходнасць у бесперапынным развіцці кампетэнцый;
- быць здольнымі сфармуляваць ролі і задачы маладзёжных работнікаў, а таксама ставіць мэты, якія грунтуюцца на асноўных прынцыпах працы з моладдзю, апісаных у гэтым дакуменце;
- праводзіць бесперапынную рэфлексію з нагоды таго, ці адпавядаюць пастаўленыя задачы, якія выкарыстоўваюцца метады, а таксама спосабы арганізацыі працоўнага працэсу, асноўным прынцыпам.



## ПАЛЯПШЭННЕ ЯКАСЦІ ПРАЦЫ З МОЛАДДЗЮ ГРУНТУЕЦЦА НА::

- дакладнай і ўсёабдымнай сістэме дакументацыі і кантролі за вынікамі, папярэднімі ўмовамі, а таксама рабочым працэсам у дачыненні да мэтаў і вымерных індыкатараў;
- рэгулярным і актуальным акрэсліванні патрэбаў мясцовай моладзі;
- выразным і бесперапынным аналізе неабходнасці далейшага развіцця, а таксама адлюстраванні вынікаў адносна таго, як яны ўзаемазвязаны з папярэднімі ўмовамі і працоўным працэсам;
- працяглым удасканаленні новых нацыянальных і міжнародных даследаванняў, трэндаў і метадаў у сектары працы з моладдзю;
- сумесных намаганнях і супрацоўніцтве паміж усімі зацікаўленымі бакамі для паляпшэння якасці працоўнага працэсу, а таксама для ўкаранення інавацыйных метадаў і тэхналогій;
- бесперапынным развіцці навыкаў і ведаў маладзёжных работнікаў на аснове выразнай сістэмы кампетэнцый ў спалучэнні з аналізам вынікаў і патрэбаў на мясцовым узроўні, а таксама моцных і слабых бакоў працоўнага працэсу.



## ПАРТНЁРЫ НА НАЦЫЯНАЛЬНЫМ УЗРОЎНІ

www.oead.at

www.erasmusplus-jeunesse.fr

www.leargas.ie

www.iuventa.sk

www.jint.be

www.jugendfuereuropa.de

www.jaunatne.gov.lv

www.movit.si

www.mobilnost.hr

www.erasmus-plus.gr

www.aha.li

www.anpcdefp.ro

www.ufm.dk

www.tka.hu

www.jtba.lt

www.mucf.se

www.agenziagiovani.it

www.rannis.is

www.erasmusplus.nl

www.oph.fi/fi
/eun-nuoriso-ohjelmat

www.juventude.pt

www.dzs.cz

www.movetia.ch

www.aktivungdom.eu

www.erasmusplus.rs

www.euroopanoored.eu

## МІЖНАРОДНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

www.pjp-eu.coe.int

www.youthforum.org

www.youthforum.org

www.intercityyouth.eu

www.poywe.org

www.salto-youth.net/eeca

www.salto-youth.net/see

"ПРАЦА З МОЛАДДЗЮ ГРУНТУЕЦЦА НА КАШТОЎНАСЦЯХ... І ПРАСОЎВАННІ ПРАВОЎ МОЛАДЗІ."

